Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ А. А. Корбут
«___» ___________2016 г.
Рэгістрацыйны № _____/

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа*
*і ахова гісторыка-культурнай спадчыны,*
*напрамкаў спецыяльнасці 1-23 01 12-03 Музеязнаўства,*
*1-23 01 12-04 Культурная спадчына і турызм*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*І. І. Бамбешка,* старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*І. Н. Колабава,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. А. Трусаў,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 26.11.2015);
*саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 29.03.2016);
*навукова-метадычным* саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 25.04.2016)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. І. Бамбешка

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма практыкі распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011 г.; адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны 2013 г.; пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2010 г. № 860 «Об утверждении Положения о практике студентов, курсантов, слушателей»; інструкцыяй аб парадку і асаблівасцях праходжання практыкі студэнтамі, якім пасля завяршэння навучання надаюцца педагагічныя кваліфікацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.03.2012 г. № 24; тыпавым вучэбным планам і графікам адукацыйнага працэсу.

Вучэбная і вытворчая практыка студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» з'яўляецца абавязковай часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыяліста і прадугледжвае цесную сувязь тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў будучых музейных супрацоўнікаў.

Практыка падраздзяляецца на вучэбную і вытворчую. Вытворчая практыка ўключае практыку па напрамку спецыяльнасці і пераддыпломную.

Кожная практыка, у залежнасці ад віду, мае свае асобныя мэты, задачы і вынікі. Усе віды практыкі ўзаемазвязаны ў адзіны працэс набыцця студэнтамі практычных ведаў у галіне падрыхтоўкі будучых музейных супрацоўнікаў і спецыялістаў па культурным турызме.

**Напрамак спецыяльнасці «музеязнаўства»:**

– вучэбная (археолага-этнаграфічная) – I курс (2 семестр, 2 тыдні);

– вучэбная музейная (азнаямленчая) – II курс (3–4 семестр, 2 тыдні) ;

– вытворчая (экскурсійная) – III курс (6 семестр, 3 тыдні);

– вытворчая (музейная фондавая) – IV курс (7 семестр, 4 тыдні);

– вытворчая (пераддыпломная) – IV курс (8 семестр, 2 тыдні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Напрамак спецыяльнасці «культурная спадчына і турызм»:**

– вучэбная (археолага-этнаграфічная) – I курс (2 семестр, 2 тыдні);

– вучэбная музейная (азнаямленчая) – II курс (3–4 семестр, 2 тыдні);

– вытворчая (экскурсійная) – III курс (6 семестр, 3 тыдні);

– вытворчая (менеджарская) – IV курс (7 семестр, 4 тыдні);

– вытворчая (пераддыпломная) – IV курс (8 семестр, 2 тыдні).

У выніку праходжання практыкі студэнт павінен замацаваць, пашырыць і сістэматызаваць веды, набытыя пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін па профілю спецыяльнасці.

Студэнты павінны засвоіць першасныя навыкі і ўменні па абранай спецыяльнасці, падрыхтавацца да самастойнай прафесійнай дзейнасці.

Базамі практыкі для студэнтаў з'яўляюцца адпавядаючыя профілю падрыхтоўкі спецыялістаў музейныя ўстановы і турыстычныя арганізацыі, з якімі заключаюцца дагаворы на правядзенне практыкі.

Студэнты, якія навучаюцца на аснове дагавору аб мэтавай падрыхтоўцы, вытворчую і пераддыпломную практыку праходзяць у арганізацыях (установах), з якімі заключаны дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы.

Пры размеркаванні студэнтаў па базах практыкі ўлічваецца напрамак спецыяльнасці, па якому навучаюцца студэнты.

Асноўныя мэты практыкі – авалоданне практычнымі навыкамі, уменнямі і падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці па спецыяльнасці.

<u>Мэты вучэбнай (археолага-этнаграфічнай) практыкі</u> – замацаванне і паглыбленне тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі ў працэсе навучання.

Вучэбная (археолага-этнаграфічная) практыка для студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» з'яўляецца важным элементам у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, дапаўняе і ўзбагачае адукацыйны працэс.

Праграма вучэбнай практыкі накіравана на знаёмства з археалагічнымі і этнаграфічнымі палявымі даследаваннямі, асобнымі помнікамі археалогіі і этнаграфіі, а таксама з археалагічнымі і этнаграфічнымі калекцыямі беларускіх музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбную (археолага-этнаграфічную) практыку студэнты праходзяць у арганізацыях, адпавядаючых профілю падрыхтоўкі спецыялістаў і маючых матэрыяльную базу для правядзення дадзенай практыкі. Базавай установай для правядзення вучэбнай (археолага-этнаграфічнай) практыкі з’яўляецца Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Задачамі вучэбнай (археолага-этнаграфічнай) практыкі з’яўляюцца:

– замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў, атрыманых па курсе «Археалогія» і «Этналогія і этнаграфія Беларусі»;

– набыццё першасных практычных навыкаў правядзення археалагічных і этнаграфічных даследаванняў у палявых умовах;

– азнаямленне з дакументацыяй, складаемай у працэсе правядзення археалагічных і этнаграфічных даследаванняў;

– азнаямленне з музейнымі экспазіцыямі, якія ўтрымліваюць археалагічныя і этнаграфічныя экспанаты.

Праграма вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі накіравана на знаёмства з музеямі краіны розных профіляў. Вучэбная практыка праводзіцца ў форме экскурсій па вызначаных кіраўніком практыкі музейных установах. Згодна з вучэбным планам практыка праводзіцца без адрыву ад адукацыйнага працэсу.

Мэты вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі – практыка накіравана на знаёмства студэнтаў з музеямі Беларусі. Вучэбная музейная (азнаямленчая) практыка праводзіцца перад пачаткам вывучэння студэнтамі шэрагу музеязнаўчых курсаў і, такім чынам, закладае аснову ў далейшым працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў-музеязнаўцаў.

Задачай вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў практычных уменняў і навыкаў па вывучаемых вучэбных дысцыплінах.

Пры праходжанні вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі адбываецца:

– падрыхтоўка студэнтаў да паглыбленага практычнага вывучэння вучэбных дысцыплін;

– набыццё студэнтамі першасных практычных навыкаў і ўменняў па абранай спецыяльнасці;

азнаямленне студэнтаў:

– з разнастайнымі па профілю музейнымі ўстановамі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– з экспазіцыямі вядучых музейных установ краіны;
– з музейнай сеткай краіны;
– з музеямі розных профіляў і тыпаў;
– са структурнай пабудовай музейнай установы;
– з асноўнымі кірункамі дзейнасці музеяў;
– з музейнымі экспазіцыямі;
– з часовымі музейнымі выставамі;
– з сегментацыяй наведвальнікаў музеяў па наступных прыкметах: дэмаграфічных; сацыяльна-эканамічных, узроставых, канфесіянальных і г. д.

Вытворчая (экскурсійная) практыка непасрэдна звязана з тэарэтычнымі курсамі па музеязнаўчых і турыстычных дысцыплінах, у першую чаргу з курсам музейнай педагогікі. Студэнты атрымліваюць магчымасць спалучыць свае тэарэтычныя веды з практыкай музейнай дзейнасці.

Студэнты праходзяць практыку ў арганізацыях, адпавядаючых профілю падрыхтоўкі спецыялістаў.

Практыка садзейнічае засваенню канкрэтнага зместу дзейнасці адпаведнага музея ў кірунку культурна-адукацыйнай работы. Практыка праводзіцца ў музеях розных профіляў і тыпаў.

Вытворчая экскурсійная практыка непасрэдна далучае студэнтаў-практыкантаў да правядзення экскурсій, дае магчымасць набыць навыкі самастойнай распрацоўкі і правядзення аглядных і тэматычных экскурсій.

Мэты вытворчай (экскурсійнай) практыкі – удасканаленне тэарэтычных ведаў па музеязнаўчых прадметах, атрыманне практычных навыкаў па аднаму з асноўных напрамкаў музейнай дзейнасці, авалоданне навыкамі экскурсійнай работы, фарміраванне ў студэнтаў навыкаў у галіне асветніцка-выхаваўчай дзейнасці музеяў, методыкі і практыкі экскурсійнага абслугоўвання насельніцтва.

Задачамі вытворчай (экскурсійнай) практыкі з’яўляюцца: набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў па спецыяльнасці, замацаванне, пашырэнне і сістэматызацыя ведаў, атрыманых пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін па профілю спецыяльнасці.

Пры праходжанні вытворчай (экскурсійнай) практыкі студэнты:
– набываюць агульнае ўяўленне аб культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў розных профіляў і тыпаў;
– знаёмяцца з працэсам распрацоўкі і правядзення аглядных і тэматычных экскурсій;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– паглыбляюць і пашыраюць тэарэтычныя веды ў галіне экскурсазнаўства;

– знаёмяцца з экскурсійнай тэматыкай і планамі музеяў розных профіляў і тыпаў;

– знаёмяцца з работай музейных экскурсаводаў;

– знаёмяцца з працэсам падрыхтоўкі і правядзення экскурсій;

– ствараюць тэхналагічную карту адной экскурсіі;

– авалодваюць навыкамі правядзення аглядных і тэматычных экскурсій для розных катэгорый наведвальнікаў на турыстычных маршрутах.

Вытворчая (музейная фондавая) практыка прадугледжвае ўдасканаленне тэарэтычных ведаў па музеязнаўчых прадметах, атрыманне практычных навыкаў па асноўных напрамках музейнай дзейнасці.

Падчас практыкі студэнты знаёмяцца з сучасным станам музейнай справы ў краіне. Практыка спрыяе выпрацоўцы творчага даследчыцкага падыходу да музейнай работы, набыццю імі навыкаў аналізу вынікаў сваёй працы.

Практыка садзейнічае засваенню канкрэтнага зместу дзейнасці адпаведнага музея ў кірунку навукова-фондавай работы.

<u>Мэты вытворчай (музейнай (фондавай)) практыкі</u> – атрыманне практычных навыкаў у галіне камплектавання, вывучэння і захавання фондавых калекцый музеяў, азнаямлення з асноўнымі сістэмамі ўліку прадметаў музейных калекцый. Вытворчая музейная фондавая практыка накіравана на паглыбленне, пашырэнне і замацаванне тэарэтычных ведаў і набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў і ўменняў па навуковафондавай рабоце музеяў. Адбываецца непасрэдная практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай работы.

<u>Задачамі вытворчай (музейнай (фондавай)) практыкі</u> з’яўляюцца: набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў па спецыяльнасці, замацаванне, пашырэнне і сістэматызацыя ведаў, атрыманых пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін па профілю спецыяльнасці.

Пры праходжанні вытворчай (музейнай (фондавай)) практыкі студэнты павінны:

– набыць веды па асноўных кірунках навукова-фондавай работы музея і пазнаёміцца:

– з нарматыўнай дакументацыяй;

– навуковай пашпартызацыяй музейных прадметаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– працай навукова-метадычнай рады музея;
– навуковым камплектаваннем фондаў музея;
– збіральніцкай дзейнасцю;
– метадамі, формамі камплектавання;
– зместам і асноўнымі напрамкамі фондавай работы;
– складам і структурай музейных фондаў;
– з улікам музейных фондаў;
– рэжымамі захавання;
– фондасховішчам і яго абсталяваннем;
– выкарыстаннем музейных фондаў у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці.

Вытворчая (менеджарская) практыка прадугледжвае ўдасканаленне тэарэтычных ведаў па прадметах спецыяльнасці, атрыманне практычных навыкаў па асноўных напрамках турыстычнай дзейнасці.

Падчас вытворчай (менеджарскай) практыкі студэнты знаёмяцца з сучасным станам турыстычнай дзейнасці ў краіне. Практыка спрыяе выпрацоўцы творчага даследчыцкага падыходу да работы ў галіне турызму, набыццю імі навыкаў аналізу вынікаў сваёй працы і садзейнічае засваенню навыкаў менеджарскай дзейнасці студэнтаў у канкрэтнай турыстычнай арганізацыі.

<u>Мэты вытворчай (менеджарскай) практыкі</u> – атрыманне практычных навыкаў у галіне асаблівасцей арганізацыі турыстычных тураў (аўтобусных, авіятураў, чыгуначных турыстычных маршрутаў, групавых, індывідуальных), азнаямленне з еўрапейскімі правіламі і нормамі забеспячэння бяспекі турыстаў, набыццё практычных навыкаў у складанні дамоў дзеля ўдзельнікаў тураў. Вытворчая (менеджарская) практыка накіравана на паглыбленне, пашырэнне і замацаванне тэарэтычных ведаў і набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў і ўменняў па правядзенні сегментацыі рынку для прыцягвання кліентаў. Адбываецца непасрэдная практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай работы.

<u>Задачамі вытворчай (менеджарскай) практыкі</u> студэнтаў з’яўляюцца:
– набыццё ведаў асноўных кірункаў дзейнасці турыстычных арганізацый;
– вывучэнне рэкрэацыйных рэсурсаў краіны: прыродных, культурна-гістарычных, сацыяльна-эканамічных;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– правядзенне індывідуальнага задання ў межах адной краіны, аднаго віду адпачынку;

– складанне праграмы абслугоўвання турыстаў у падарожжы па маршруце;

– вывучэнне графіка выездаў;

– складанне інфармацыйнай абвесткі;

– правядзенне вынікаў даследавання рэкрэацыйнага патэнцыялу тэрыторыі (індывідуальнае заданне);

– распрацоўка ў адпаведнасці з нарматыўна-прававой базай турыстычнага маршруту і экскурсіі;

– правядзенне сегментацыі рынку па дэмаграфічных, сацыяльна-эканамічных, псіхаграфічных прыкметах і інш.;

– выбар мэтавай аўдыторыі для правядзення рэкламы турыстычнай установы.

Мэтамі пераддыпломнай практыкі з'яўляюцца: паглыбленне, пашырэнне, сістэматызацыя і замацаванне тэарэтычных ведаў, уменняў і навыкаў навукова-даследчай работы, атрыманых у працэсе навучання па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, непасрэдная практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай даследчай работы, напісанне дыпломнай работы.

Асноўнымі задачамі праходжання пераддыпломнай практыкі з'яўляюцца:

– засваенне і замацаванне ведаў і ўменняў студэнтаў, атрыманых у працэсе навучання па напрамаках «культурная спадчына і турызм» і «музеязнаўства» пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін па профілю спецыяльнасці;

– замацаванне практычных уменняў і навыкаў па асноўных кірунках дзейнасці музея і турыстычных арганізацый;

– набыццё навыкаў па навукова-метадычнай і даследчай рабоце музеяў і кірункаў дзейнасці турыстычных арганізацый;

– падрыхтоўка матэрыялаў да дыпломнай работы, правядзенне даследаванняў у адпаведнасці з яе тэмай;

– праверка магчымасцей самастойнай работы будучага спецыяліста ва ўмовах музея і турыстычных арганізацый.

У задачы практыкі ўваходзіць правядзенне пошукаў крыніц і літаратуры па тэме дыпломнай работы, збор і апрацоўка крыніц дыпломнага даследавання, напісанне гістарыяграфічнага агляду літаратуры па тэме дыпломнага даследавання, вывучэнне і авалоданне метадамі гістарычнага даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя і кіраўніцтва практыкай

Асновай для праходжання практыкі з'яўляецца загад рэктара. Праект загада рыхтуецца дэканатам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый на падставе прапаноў кафедр факультэта.

Непасрэднае кіраўніцтва практыкай ажыццяўляе кіраўнік практыкі ад кафедры.

Агульнае кіраўніцтва практыкай у музеі ўскладаецца на кіраўніка адпаведнай установы ці іншага ўпаўнаважанага ім работніка ўстановы.

Непасрэднае кіраўніцтва практыкай студэнтаў у музеі ці ў яго структурным падраздзяленні ажыццяўляе вопытны работнік установы, які назначаецца загадам кіраўніка ўстановы.

Тэрмін практыкі вызначаецца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі і графікам адукацыйнага працэсу БДУКМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

Змест практыкі на ўсіх яе этапах забяспечвае выкананне дзяржаўных патрабаванняў да мінімуму зместу і ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны і вызначаецца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны 2013 г., тыпавым вучэбным планам, графікам адукацыйнага працэсу.

Перад пачаткам практыкі праводзіцца ўстановачны інструктаж па правілах праходжання практыкі, па ахове працы і тэхніцы бяспекі. Студэнты інфармуюцца аб тэрмінах, месцах праходжання і праграме практыкі.

У час праходжання практыкі студэнты падпарадкоўваюцца правілам унутранага працоўнага распарадку музея і турыстычных арганізацый, выконваюць правілы аховы працы, тэхнікі бяспекі, вытворчай санітарыі і ўсе ўказанні кіраўніка практыкі ад базы. У выпадку парушэння правілаў унутранага працоўнага распарадку, патрабаванняў тэхнікі бяспекі студэнт можа быць адхілены ад праходжання практыкі з наступнай неатэстацыяй па практыцы.

У перыяд праходжання практыкі кожны студэнт пад кантролем непасрэднага кіраўніка практыкі ад базы выконвае праграму практыкі і адзначае яе выкананне ў дзённіку праходжання практыкі, які з'яўляецца сродкам кантролю за ходам выканання праграмы практыкі. Дзённік павінен запаўняцца штодзённа. У ім змяшчаюцца звесткі аб змесце і выніках работы за дзень, аб сабраным, сістэматызаваным і прааналізаваным фактычным матэрыяле, выказваюцца свае ўражанні і меркаванні.

Пасля завяршэння вытворчай і пераддыпломнай практыкі студэнт даводзіць да ведама кіраўніка практыкі ад базы асноўныя палажэнні і вывады, зробленыя ім па выніках праходжання практыкі. Кіраўнік практыкі ад базы дае пісьмовы водзыў аб рабоце студэнта (групы студэнтаў) у перыяд практыкі. Па выніках вучэбнай практыкі пісьмовая характарыстыка (водзыў) не прадастаўляецца.

Кожны студэнт здае кіраўніку ад кафедры індывідуальную справаздачу ў надрукаванай форме. Дзённікі практыкі і справаздачы павінны быць падпісаны кіраўніком практыкі ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

базы. Справаздача зацвярджаецца кіраўніком (наменнікам кіраўніка) базавай арганізацыі.

Па заканчэнні вучэбнай практыкі студэнты здаюць залік. Вынікі здачы заліку па дадзеным відзе практыкі ацэньваюцца ацэнкай «залічана»/«незалічана».

Вынікі вытворчай практыкі студэнты абараняюць перад камісіяй у складзе кіраўнікоў практыкі ад базы і кіраўніка ад кафедры. Па выніках вытворчай практыкі ставіцца дэферэнцыраваны залік.

Станоўчая ацэнка заносіцца кіраўніком практыкі ад кафедры ў залікова-экзаменацыйную ведамасць і заліковую кніжку.

Студэнт, які не выканаў праграму практыкі, атрымаў адмоўны водгук кіраўніка практыкі ад базы, нездавальняючую ацэнку пры здачы заліку або быў хворы падчас практыкі, праходзіць яе паўторна па дамоўленасці з базай практыкі ў вольны ад адукацыйнага працэсу час (пасля заняткаў або ў час канікул). Невыкананне праграмы практыкі без уважлівых прычын з'яўляецца падставай для адлічэння студэнта з універсітэта.

Вынікі практыкі, найбольш цікавыя прапановы і меркаванні выносяцца і абмяркоўваюцца на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і пры станоўчай ацэнцы могуць быць рэкамендаваны да друку.

**Вучэбная (археолага-этнаграфічная) практыка (I курс)**

Змест вучэбнай (археолага-этнаграфічнай) практыкі вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі. Вучэбная археолага-этнаграфічная практыка арганізуецца на першым курсе з адрывам ад навучання. Праходзіць яна ў форме экскурсій у музеі, студэнты далучаюцца да працы ў музейных фондах па першаснай апрацоўцы археалагічных і этнаграфічных калекцый, па магчымасці ўдзельнічаюць у археалагічных раскопках і этнаграфічных экспедыцыях.

На працягу практыкі студэнты знаёмяцца з:

– матэрыяламі аб археалагічных і этнаграфічных даследаваннях, біяграфіямі вядомых археолагаў і этнографаў;

– навуковым апісаннем археалагічных і этнаграфічных прадметаў з калекцыі музея;

– афармленнем навуковага пашпарта;

– інструкцыяй па ўліку і захаванні музейных каштоўнасцей;

– археалагічнымі і этнаграфічнымі калекцыямі з фондаў музеяў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– методыкай археалагічных раскопак і асобнымі помнікамі археалогіі;
– методыкай правядзення этнаграфічных экспедыцый;
– методыкай апрацоўкі і класіфікацыі археалагічных і этнаграфічных музейных прадметаў;
– метадамі кансервацыі і рэстаўрацыі археалагічных і этнаграфічных прадметаў;
– сістэмай уліку і камплектавання археалагічных і этнаграфічных калекцый;
– рэжымамі ўтрымання археалагічных і этнаграфічных прадметаў;
– захаваннем музейных археалагічных і этнаграфічных калекцый у экстрэмальных умовах (пажары, стыхійныя бедствы і інш.).

**Вучэбная музейная (азнаямленчая) практыка (II курс)**

Змест вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі. Вучэбная музейная (азнаямленчая) практыка арганізуецца на другім курсе без адрыву ад навучання. Праходзіць яна ў форме экскурсій у музеях г. Мінска.

У працэсе вучэбнай музейнай (азнаямленчай) практыкі адбываецца замацаванне і паглыбленне тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі па музейных дысцыплінах.

Студэнты знаёмяцца з матэрыяламі па наступных пытаннях:
– гісторыя заснавання і дзейнасці адпаведнага музея;
– вызначэнне профілю і тыпу адпаведнага музея;
– асноўныя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць дзейнасць музея;
– асноўныя напрамкі дзейнасці музея;
– асноўныя працэсы музейнай дзейнасці;
– арганізацыйная структура музея;
– колькасныя паказчыкі дзейнасці музея: аб’ём фонду, агульная колькасць наведвальнікаў і інш.;
– кірункі навуковых даследаванняў і метадычнай дзейнасці (пры іх наяўнасці);
– перспектывы развіцця музея;
– пастаянная музейная экспазіцыя (падчас экскурсіі ці самастойна), часовыя музейныя выставы (падчас экскурсіі ці самастойна), фонды адпаведнага музея (па магчымасці);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праслухоўванне некалькіх экскурсій (аглядных і тэматычных).

Змест практыкі можа быць скарэкціраваны і адаптаваны да асаблівасцей функцыянавання базавай установы.

**Вытворчая (экскурсійная) практыка (III курс)**

Вытворчая экскурсійная практыка студэнтаў арганізуецца на III курсе. Змест вытворчай (экскурсійнай) практыкі вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі.

У ходзе вытворчай (экскурсійнай) практыкі адбываецца замацаванне і паглыбленне тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі па дысцыплінах спецыяльнасці.

Студэнты вывучаюць матэрыялы па наступных пытаннях:

– матэрыяльна-тэхнічная база музея;

– асноўныя кірункі культурна-адукацыйнай работы;

– практыка правядзення культурна-адукацыйных мерапрыемстваў;

– праграмы па музейнай педагогіцы;

– работа клубаў, гурткоў;

– узоры інфармацыйна-рэкламнай прадукцыі;

– работа музейных экскурсаводаў;

– методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для розных катэгорый наведвальнікаў;

– асноўныя прыёмы правядзення аглядных і тэматычных музейных экскурсій;

– культура мовы і паводзін падчас правядзення экскурсіі.

Студэнты павінны набыць уменні і навыкі:

– правядзення адукацыйна-выхаваўчых мерапрыемстваў;

– складання праграм па музейнай педагогіцы;

– распрацоўкі планаў работы клубаў, гурткоў;

– складання ўзораў інфармацыйна-рэкламнай прадукцыі;

– работы музейных экскурсаводаў;

– падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для розных катэгорый наведвальнікаў;

– правядзення аглядных і тэматычных музейных экскурсій. Студэнты самастойна распрацоўваюць аглядную і тэматычную экскурсіі.

Змест практыкі можа быць скарэкціраваны і адаптаваны да асаблівасцей функцыянавання базавай установы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вытворчая (музейная (фондавая)) практыка (IV курс)**

Вытворчая (музейная (фондавая)) практыка студэнтаў арганізуецца на IV курсе. Змест вытворчай (музейнай (фондавай)) практыкі вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі.

Замацаванне студэнтамі тэарэтычных ведаў па спецыяльных дысцыплінах і набыццё прафесійных уменняў адбываецца па наступных змястоўных раздзелах.

**1. Музейныя фонды**

Падчас практыкі студэнты вывучаюць матэрыялы па наступных пытаннях:

– профіль рэгіёна (прадпрыемства, міністэрства, установы, філіяла), які абслугоўвае музей, асноўныя групы наведвальнікаў, характар іх інфармацыйных патрэб, мэты наведвання імі музея;

– фонды музея, іх асноўныя характарыстыкі (галіновыя, відавыя, тэматычныя, тыпалагічныя, храналагічныя, музейныя);

– гісторыя стварэння музейных калекцый;

– арганізацыйная структура фондаў музея, профіль камплектавання і крытэрыі адбору экспанатаў у музеях у кожнае яго структурнае падраздзяленне;

– задачы і змест работы аддзелаў камплектавання і фондасховішча;

– рэгламентуючая дакументацыя, інструкцыі аб службовых абавязках супрацоўнікаў аддзелаў;

– крыніцы паступлення ў музей прадметаў музейнага значэння;

– работа фондава-закупачнай камісіі;

– сістэма ўліку розных відаў дакументаў;

– аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў у аддзелах камплектавання і фондасховішчах.

Студэнты павінны набыць уменні і навыкі:

– работы з рэгламентуючай дакументацыяй;

– складання актаў прыёму прадметаў у музейны фонд;

– распрацоўкі сістэмы ўліку розных відаў дакументаў;

– прафілактычнай апрацоўкі музейных калекцый;

– працы ў музейнай бібліятэцы;

– працы ў музейным архіве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. Каталагізацыя і ўлік музейных экспанатаў

Падчас практыкі студэнты вывучаюць матэрыялы па наступных пытаннях:

– інструкцыйна-метадычныя матэрыялы па асноўных кірунках навукова-фондавай работы;

– асноўныя прынцыпы, метады і формы пошуку новых музейных прадметаў;

– асноўныя патрабаванні пры стварэнні адкрытага захавання фондаў;

– распрацоўкі і стварэнне навукова-дапаможных форм уліку;

– працэс стварэння навуковага пашпарта на музейныя прадметы;

– навуковае апісанне музейнай калекцыі;

– стварэнне і выкарыстанне электроннага музейнага каталога;

– складанне тапаграфічных вопісаў паказальнікаў (згодна з планам работы музея);

– працэс правядзення кантролю наяўнасці музейных прадметаў з уліковай дакументацыяй.

Студэнты павінны набыць уменні і навыкі:

– работы з інструкцыйна-метадычнымі матэрыяламі па асноўных кірунках навукова-фондавай работы;

– выкарыстання асноўных прынцыпаў, метадаў і форм пошуку новых музейных прадметаў;

– выкарыстання навукова-дапаможных форм уліку;

– стварэння навуковага пашпарта на музейныя прадметы;

– навуковага апісання музейнай калекцыі;

– стварэння і выкарыстання электроннага музейнага каталога;

– складання тапаграфічных вопісаў паказальнікаў (згодна з планам работы музея);

– правядзення кантролю наяўнасці музейных прадметаў з уліковай дакументацыяй.

## Вытворчая (менеджарская) практыка (IV курс)

Вытворчая (менеджарская) практыка студэнтаў арганізуецца на IV курсе. Змест практыкі вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі.

Замацаванне студэнтамі тэарэтычных ведаў па спецыяльных дысцыплінах і набыццё прафесійных уменняў адбываецца па наступных змястоўных раздзелах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1. Музейны менеджмент

Падчас практыкі студэнты вывучаюць матэрыялы па наступных пытаннях:

– вывучэнне матэрыялаў па краінах, рэгіёнах (Беларусь, Еўропа, Азія і інш.), якія абслугоўвае турыстычная арганізацыя, асноўныя групы наведвальнікаў, характар іх патрэб;

– выяўленне рэкрэацыйных рэсурсаў краін: прыродных, культурна-гістарычных, сацыяльна-эканамічных;

– планаванне работы па фарміраванні базы спажыўцоў турыстычных паслуг;

– методыка працы з кліентамі;

– правілы складання дагавораў са спажыўцамі;

– сістэма ўліку розных відаў дакументаў;

– рэгламентуючая дакументацыя, інструкцыі аб службовых абавязках супрацоўнікаў турыстычных фірм;

– склад картатэк турыстычных маршрутаў (унутраныя і знешнія);

– існуючыя ў турыстычных фірмах метады размяшчэння і расстаноўкі дакументаў;

– аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў у аддзелах продажу;

– магчымасці працы турыстычных фірм у камп'ютарнай сетцы Інтэрнэту;

– наяўнасць і выкарыстанне турыстычнага архіва.

Студэнты павінны набыць уменні і навыкі:

– работы з рэгламентуючай дакументацыяй;

– распрацоўкі сістэмы ўліку розных відаў дакументаў;

– планавання работы па фарміраванні базы даных кліентаў;

– сістэматызацыі і выкарыстання дакументаў пры працы са спажыўцамі;

– выкарыстання асноўных метадаў і форм пошуку новых спажыўцоў турыстычных паслуг;

– працы турыстычнай арганізацыі ў камп'ютарнай сетцы Інтэрнэту;

– апісання турыстычнага маршруту;

– стварэння і выкарыстання электроннага турыстычнага каталога.

## Вытворчая (пераддыпломная) практыка (IV курс)

Вытворчая (пераддыпломная) практыка арганізуецца ва ўстановах, адпавядаючых профілю падрыхтоўкі спецыялістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест яе вызначаецца мэтамі і задачамі дадзенага віду практыкі, тэмай дыпломнай работы.

Мэтамі вытворчай (пераддыпломнай) практыкі з’яўляюцца паглыбленне, пашырэнне, сістэматызацыя і замацаванне тэарэтычных ведаў, уменняў і навыкаў навукова-даследчыцкай работы, атрыманых у ходзе адукацыйнага працэсу ў навучальнай установе, непасрэдная практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай даследчыцкай работы, напісанне варыянта дыпломнай работы.

Задачамі вытворчай (пераддыпломнай) практыкі з’яўляюцца вывучэнне і авалоданне метадамі гістарычнага даследавання, напісанне гістарыяграфічнага і крыніцазнаўчага агляду па тэме дыпломнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Афармленне індывідуальнай справаздачы па практыцы

Практыка ўяўляе сабой адну з форм кантралюемай самастойнай работы студэнта. Пасля завяршэння практыкі студэнты складаюць індывідуальную справаздачу, якая перадаецца кіраўніку практыкі пры правядзенні заліку.

Справаздача ўключае:

– тытульны ліст (указваецца ўстанова адукацыі, кафедра, імя і прозвішча студэнта, назва і дата правядзення практыкі);

– асноўная частка (указваецца назва базы практыкі, прыводзіцца яе структурная характарыстыка, пастаўленыя ў працэсе практыкі задачы, вызначаецца змест выкананай работы, што даручалі студэнту-практыканту, адзначаецца выкананне пастаўленых задач, індывідуальных заданняў);

– заключэнне (вызначаюцца навыкі, набытыя ў працэсе практыкі, пры неабходнасці робяцца заўвагі і прапановы па ўдасканаленні дзейнасці ўстановы, дзе студэнт праходзіў практыку, заўвагі і прапановы па паляпшэнні праходжання самога працэсу практыкі).

Справаздача друкуецца з выкарыстаннем камп’ютара і прынтара на адным баку аркуша белай паперы фармату А4 (210х297 мм).

Набор тэксту справаздачы здзяйсняецца з выкарыстаннем тэкставага рэдактара Word, шрыфтам Times New Roman, памерам 14 пунктаў. Колькасць знакаў у радку павінна складаць 60–70, міжрадковы інтэрвал павінен складаць 1,5 інтэрвалу, колькасць тэкставых радкоў на старонцы – 39–40.

Памеры палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм.

Аб’ём справаздачы не павінен перавышаць 5 старонак.

Нумарацыя старонак робіцца арабскімі лічбамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Практычныя заданні

### Вытворчая (экскурсійная) практыка (III курс)

Студэнты-практыканты павінны:

– вызначыць асноўныя кірункі адукацыйна-выхаваўчай работы музея;

– скласці прыкладны план правядзення адукацыйна-выхаваўчых мерапрыемстваў;

– распрацаваць прыкладны план работы гурткоў пры музеі;

– распрацаваць тэматыку заняткаў у клубе ці гуртку;

– распрацаваць прыкладны ўзор інфармацыйна-рэкламнай прадукцыі;

– скласці план правядзення экскурсій музея;

– наведаць аглядныя і тэматычныя экскурсіі;

– вызначыць прыёмы і метады, выкарыстаныя ў наведаных экскурсіях;

– вызначыць методыку падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для розных катэгорый наведвальнікаў;

– самастойна распрацаваць аглядную і тэматычную экскурсіі.

### Вытворчая музейная (фондавая) практыка (IV курс)

Студэнты-практыканты павінны:

– скласці структуру фондаў музея;

– вызначыць задачы і змест работы аддзелаў камплектавання і фондасховішча;

– скласці пералік рэгламентуючай дакументацыі і інструкцый аб службовых абавязках супрацоўнікаў аддзелаў;

– вызначыць асноўныя крыніцы паступлення ў музей прадметаў музейнага значэння;

– апісаць гісторыю стварэння музейнай калекцыі (па выбары);

– скласці некалькі актаў прыёму прадмета ў музейны фонд;

– скласці навуковы пашпарт на музейныя прадметы;

– вызначыць тэхналагічныя працэсы ў аддзелах камплектавання і фондасховішчах музея.

### Вытворчая (менеджарская) практыка (IV курс)

Студэнты-практыканты павінны:

– скласці структуру турыстычнай арганізацыі і яе паслуг;

– вызначыць задачы і змест работы аддзелаў турыстычнай арганізацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– скласці пералік рэгламентуючай дакументацыі і інструкцый аб службовых абавязках супрацоўнікаў аддзелаў турыстычнай арганізацыі;

– спланаваць дзейнасць турыстычнай арганізацыі на месяц, год, перспектыўны план (3–5 гадоў);

– вызначыць рэкрэацыйныя рэсурсы краіны: прыродныя, культурна-гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя;

– скласці праграмы абслугоўвання турыстаў у падарожжы па маршруце;

– вывучыць графікі выездаў;

– скласці інфармацыйныя абвесткі;

– распрацаваць у адпаведнасці з нарматыўна-прававой базай турыстычны маршрут і экскурсію;

– правесці сегментацыю рынку па асноўных кірунках: дэмаграфічны, сацыяльна-эканамічны, псіхаграфічны;

– правесці выбар мэтавай аўдыторыі для правядзення рэкламы турыстычнай установы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі
## па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў у час праходжання вучэбнай і вытворчай практыкі арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам. Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі рэфератаў па адпаведнай тэматыцы, падрыхтоўка і правядзенне тэматычных і аглядных экскурсій, падрыхтоўка прэзентацый і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, а таксама ў час правядзення экзамену.

Выкладчык–кіраўнік практыкі знаёміць студэнтаў са спецыфікай той ці іншай самастойнай работы і спосабамі яе кантролю падчас арганізацыйнага сходу.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі
## вынікаў вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў накіравана на замацаванне і паглыбленне тэарэтычных ведаў, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па музейных і турыстычных дысцыплінах.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбнай і вытворчай практыкай і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вынікаў практыкі студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У працэс правядзення вучэбнай і вытворчай практыкі мэтазгодна ўкараняць методыкі актывізацыі самастойнай дзейнасці і дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА**
**ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ**

*для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны,*
*напрамкаў спецыяльнасці 1-23 01 12-03 Музеязнаўства,*
*1-23 01 12-04 Культурная спадчына і турызм*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 0,99. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.